# «Неюбілеі» ансамбля «Бярозка»




**Сёння народны ансамбль народнай песні «Бярозка» вядомы не толькі ў Хоцімскім раёне. Калектыў шмат гастралюе па бліжэйшых населеных пунктах суседняй Расіі, прымае ўдзел у фестывалях і аглядах-конкурсах рознага ўзроўню. Ды і святы, якія праходзяць у раённым цэнтры, складана сабе ўявіць без выступлення артыстаў з аграгарадка Бярозкі, або гэта будзе на сцэне, або на падворку. Можна сказаць упэўнена – у ансамбля ёсць свой твар, свая асаблівая манера выканання. Яны пазнавальныя. І многія чакаюць менавіта іх на зборных**

Калектыў існуе працяглы час (гэтую лічбу я назаву пазней), і склад яго неаднаразова мяняўся, мяняўся рэпертуар, а нязменным заставалася і застаецца адно – усе ўдзельнікі закаханыя ў сваю справу, закаханыя ў народную песню, у народны танец у традыцыі беларускага народа. Трэба аддаць ім належнае – «Бярозка» умее спалучаць беларускі і рускі фальклор, творчасць сучасных кампазітараў са складанымі аранжыроўкамі і песні, як кажуць, «пад баян». Усё гэта і называецца прафесіяналізм, а ён, як вядома, напрацоўваецца з гадамі. І вось тут я агучу ўзрост ансамбля. У гэтым годзе яму спаўняецца... 50 гадоў! Праўда адразу трэба ўнесці нейкую яснасць – у 1973 годзе гэта быў яшчэ не ансамбль, не кажучы ўжо пра статус «народны», які з'явіўся значна пазней.

Ля вытокаў стаялі, не пабаюся гучнага слова, легендарная Кацярына Міронаўна Лаушчанка, якая прыйшла працаваць дырэктарам у новы Дом культуры ў вёсцы Бярозкі, і акампаніятар і мастацкі кіраўнік Міхаіл Сямёнавіч Казімірскі. Вакол іх утварылася невялікая група жанчын, якія збіраліся і спявалі народныя песні, што называецца, для сябе, не марачы аб вялікіх сцэнах, канцэртах і абсалютна не лічачы сябе артысткамі. Але, як з маленькага ручайка пачынаецца вялікая паўнаводная рака, так з гэтага маленькага аматарскага калектыву развіўся цяпе-

Захаранка, якая кіруе ансамблем больш за 20 гадоў, прасіла нават не акцэнтаваць увагу на гэтым факце. Неяк нясціпла атрымліваецца – «Бярозцы» 50 гадоў, разважае яна. І сапраўды, адпраўной кропкай сваёй творчай біяграфіі калектыў лічыць іншую дату. 11 лютага 1998 года, калі ансамблю з Бярозак было прысвоена званне народны. Але і ў гэтым выпадку бягучы год для калектыву юбілейны – 25 гадоў. І з якім жа багажом прыйшлі артысты да гэтай адзнакі? Чым вымераць талент і запатрабаванасць артыстаў? Можа вялізарнай колькасцю грамат і дыпломаў розных ступеняў і ўзроўняў? Або назапашаным багатым рэпертуарам? А можа любоўю гледачоў? У саміх удзельнікаў на такія развагі проста няма часу, як і на святкавання юбілеяў, ці як яны самі іх характарызуюць «неюбілеяў». Калектыў жыве ў напружаным графіку ад чарговага канцэрта да чарговага свята, у рэпетыцыях, пошуках новых форм, новых песень.

Чытаючы творчую афіцыйную характарыстыку на народны ансамбль народнай песні «Бярозка», я наткнуўся на нетыповую для канцылярскага стылю падобных дакументаў, яркі і ёмісты выраз. Гэтай фразай я хачу скончыць гэты невялікі нарыс, пажадаўшы перад гэтым калектыву доўгіх і доўгіх гадоў існавання да чарговых «неюбілеяў». А выраз такі: «Калектыў працуе ў поўную сілу, не шкадуючы сябе».

**Алесь ЛЕСІН**

**Лесін, А. «Неюбілеі» ансамбля «Бярозка»** : пра народны ансамбль народнай песні «Бярозка» з аграгарадка Бярозкі / Алесь Лесін // Шлях Кастрычніка. — 2023. — 23 верасня. — С. 9.